ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менгаркому ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 60 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.
Кошт асобнага №—2 кап.

№ 86 (1355) | АЎТОРАК, 14-га красавіка 1931 г.

Усім радыё-вузлам і райкомам ЛКСМБ

У гонар 10-й гадавіны органу ЦК ЛКСМБ—газэты „Чырвоная Зьмена" арганізоўваецца ўсебеларускі радыё-сход комсамолу і ўсяе працоўнае моладзі. Сход адбудзецца 19 красавіка а 19-й гадзіне ўвечары і працягнецца да 20 гадзін 30 хв.

У Менску з дакладам выступіць прадстаўнік ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмены", у спрэчках выступяць Гомель („Чырвоны Кастрычнік"), Слуцак, Дрыса, Віцебск і Ворша. Рэжым выступленьня для Віцебску і Гомелю—8 хв. і для астатніх—6 хв. Словы перадаюцца выключна ў паказаным парадку, па магчымасьці можна даць музычныя канцоўкі.

Пробная пераклічка прызначаецца на 18 красавіка 0 гадз. 15 хв.

Райкомам КСМ прапануецца правесьці самую шырокую падрыхтоўчую работу ў сэнсе забясьпечаньня 100 проц. яўкі комсамолу і працоўнай моладзі, а таксама тэхнічна падрыхтаваць радыё-вузлы і радыё-прыёмнікі.

Нам. У. Н. Р.—Наўменка.
Заг. аддзелу тэорыі і прапаганды ЦК ЛКСМБ Пэрліна

Правяраем падрыхтаванасьць да сяўбы

НЯ МОЖА БЫЦЬ АБЯЗЬЛІЧАНЫХ ТРАКТАРОЎ

Перад выхадам у поле прымацаваць да кожнага трактара трактарыстых і прычэпныя прылады

ШКЛОЎСКІ КОМСАМОЛ НА БУДАЎНІЦТВЕ МТС

Шклоўская раённая конфэрэнцыя ЛКСМБ бярэ на сябе наступныя абавязкі па шэфству над раённай МТС і выклікае на соцыялістычнае спаборніцтва Горацкую організацыю ЛКСМБ:

Організаваць ня менш адной ініцыятыўнай групы з ліку комсамольцаў і моладзі пры кожнай ячэйцы для організацыі прыліву ў колгасы.

70 проц. трактарыстых комсамольцаў

Забясьпечыць ня менш 70 проц. комсамольцаў у лік кадраў, якія рыхтуюцца для МТС і разам з гэтым разгарнуць работу на сыстэматычнаму павышэньню кваліфікаваных кадраў МТС, уцягненьня іх у гурткі агротэхнічных ведаў, завочнага навучаньня і г. д.

Пры кожнай калёне МТС організаваць гурткі па падрыхтоўцы трактарыстых з ліку мясцовых комсамольцаў і моладзі, прыцягваючы да гэтае работы спэцыялістых—старых трактарыстых, склікаючы раённыя конфэрэнцыі апошніх.

Разгарнуць шырокую масава-палітычную работу навакол МТС, сярод шырокіх мас колгасьнікаў, беднаты і серадняцтва. Вылучыць у кожнай ячэйцы організатара масавай работы навокал МТС, згрупаваўшы гэтых організатараў навакол усёй дзейнасці МТС.

Прэч абязьлічку

Абавязваемся сіламі комсамольскіх ячэек рэалізаваць на 75000 руб. акцый трактарцэнтру. Кожная комсамольская ячэйка організуе брыгады ў дапамогу правядзеньню дагаворнай кампаніі, шчыльна ўвязвае гэту задачу з узмацненьнем існуючых колгасаў і організацыяй магутнага прыліву бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у існуючыя колгасы.

Для садзейнічаньня пасьпяховаму будаўніцтву ў МТС, мобілізаваць ня менш 100 комсамольцаў і моладзі на будаўнічыя работы, паставіўшы на паасобных вучастках, якія зробяць ударнымі, выключна комсамольцаў. Організаваць брыгады па рамонту трактароў з ліку кадраў МТС і, акрамя таго, організаваць ня менш 3-х груп з высока-кваліфікаваай сілай комсамольцаў і моладзі (сьлесараў, токараў і зваршчыкаў) з шырокім прыцягненьнем дарослых рабочых, якіх накіроўваць для работы у майстэрні на вучастках МТС. Ліквідаваць поўнасьцю абязьлічку на трактарах і сельска-гаспадарых машынах, для чаго трактары і с.-г. інвэнтар прымацаваць да паасобных брыгад трактарыстых.

Правесьці раённы дзень агляду трактарнага парку і сельска-гаспадарчых машын, стварыўшы у гэты дзень агляд падрыхтаванасьці ўсіх баявых сіл да правядзеньня другой бальшавіцкай вясны.

Даем сустрэчны

Выканаць вытворчую програму МТС, узараўшы і засеяўшы 55 трактарамі 11000 га і высунуць сумесна з МТС сустрэчны плян пасеву на 804 га, што будзе складаць вытворчы плян у 11804 га.


Для выкананьня гэтае важнейшае задачы, узяць на сябе ініцыятыву у організацыі соцыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва як унутры МТС, колгасаў, так і паміж МТС і прадпрыемствамі, што дасьць магчымасьць перадаць вопыт работы на прадпрыемстве ў організацыі працы, і максымальным скарыстаньні машын. Трактар павінен працаваць цэлыя суткі, для чаго шырока разгарнуць ударны рух, адначасова з гэтым організаваць ня менш 4-х калён выключна з комсамольцаў, паставіўшы іхную работу ўзорнай і ўдарнай.

Організаваць па калёнах МТС групы барацьбы за экономію гаручага, прэміруючы лепшыя ўдарныя брыгады за гэту работу.

Пры кожнай калёне організаваць комсамольскую ячэйку, аб'яднаўшы іх у колектыў.

Для праверкі выкананьня соцумовы склікаць сумесныя нарады (РБ і МТС) як унутры свайго раёну, так і практыкаваць абмен вопытам работы ў гэтай галіне паміж раёнамі. Для прэміраваньня лепшых ячэек вызначыць адпаведныя прэміі.

Райконфэрэнцыя ЛКСМБ.



Сталінградзкі трактарны завод высылае першы эскадрон сталёвых коняй на фронт соцыялістычнага наступу.

З фронту комсамольскай пасеўтрывогі

ГРЭСК.—(Па тэлефону ад нашага карэспондэнта).—Абвешчаны ЛКСМБ месячнік баявой вясеньняй трывогі па Грэскім раёне праходзіць ударнымі тэмпамі. З пачатку месячніку ў раёне організаваны сіламі комсамольскіх ячэек 4 новыя колгасы і 8 ініцыятыўных груп, якімі ахоплена 37 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

12-IV—была праведзена конфэрэнцыя колгаснай і бядняцка-батрацкай аднаасобнай моладзі. Конфэрэнцыя абгаварыла стан падрыхтоўкі да сяўбы і практычныя мерапрыемствы па ўдзелу моладзі.

Ёсьць і прарывы ў падрыхтоўцы да сяўбы.—Праца колгасаў не пераведзена на зьдзельшчыну і разрахунак па працаднёх. З 62 колгасаў поўнасьцю пераведзены на зьдзельшчыну толькі шэсьць.

Яўсевіцкая, Гразоўскаў і Тарыцкая ячэйкі яшчэ ня ўзялі ўдарных тэмпаў у падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы

Ц. Макарэнка

Пошта-тэлеграма

Усім РК, ГК і ўпаўнаважаным ЦК ЛКСМБ па пасеўнай кампаніі

Кантрактацыя яравых культур знаходзіцца пад пагрозай зрыву.

Шмат РК і комсамольскіх ячэек слаба ўдзельнічаюць у рабоце па контрактацыі і не мобілізоўваюць рабочую, батрацкую, колгасную і бядняцка-серадняцкую моладзь, недаацэньваюць кантрактацыі, як важнейшай гаспадарча-палітычнай работы, праяўляюць опортуністычную стаўку на самацёк, асабліва у раёнах: Касьцюковіцкім, Чырвонапольскім, Жыткавіцкім, Быхаўскім, Церахаўскім, Капаткевіцкім, Дубровенскім, Суражскім, Халопеніцкім, Тураўскім, Сьмілавіцкім, Сіроцінскім, Багушэўскім, Вушацкім, Барысаўскім, Журавіцкім і Нараўлянскім.

ЦК ЛКСМБ, пад асабістую адказнасьць сэкратароў РК і ўпаўнаважаных ЦК ЛКСМБ, прапануе:

Правесьці перагрупоўку актыву, накіроўваючы яго на слабыя вучасткі работы; мобілізаваць усіх комсамольцаў, прыцягваючы рабочую, батрацкую, колгасную і бядняцка-серадняцкую моладзь на ажыцьцяўленьне пляну па кантрактацыі.

Адозва ЦК УсеКП(б), КП(б)Б, СНК СССР і БССР аб кантрактацыі, пастанова 6-га зьезду саветаў аб колгасным будаўніцтве і новы закон аб адзіным с.-гасп. падатку на 31 год, на грунце разгортваньня масавай работы, давесьці да кожнага колгасьніка і бядняцка-серадняцкага двара.

Мобілізаваць ор-цыю на правядзеньне кантрактацыі як па соц. сэктары, так і зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на правядзеньне кантрактацыі ў аднаасобных бядняцка-серадняцкіх гаспадарках, увязваючы ўсю работу з работай па колектывізацыі і вясноваму севу.

Організуйце брыгады з комсамольцаў, колгаснай і саўгаснай моладзі для накіраваньня на работу па кантрактацыі ў аднаасобным сэктары. Організуйце грамадзкі буксір. Перадавыя павінны ўзяць адстаючыя ячэйкі, с.-саветы і паасобныя вёскі, у асаблівасьці колгасы — аднаасобнікаў мэтодамі соц. спаборніцтва і ўдарніцтва.

Паслаць комсамольцаў, вучняў навучальных установ з пэрсанальным адборам старэйшых груп ШКМ і 7-мігодак, для тэхнічнага афармленьня дагавораў па кантрактацыі.

Штучнае ўгнаеньне вельмі дрэнна вывозіцца складамі на месцы. ЦК патрабуе ад комсамолу ўзяць ініцыятыву па організацыі чырвоных абозаў, колгасьнікаў, аднаасобнікаў для вывазу штучнага ўгнаеньня.

ЦК падкрэсьлівае, што пасьпяховае правядзеньне кантракцыі патрабуе ад комсамолу сыстэматычнай работы сярод батрацка-бядняцкае моладзі, рашучага змаганьня з клясава-варожымі дзеяньнямі кулацтва, праявамі правага ўхілу і стаўкай на самацёк.

ЦК папярэджвае ад паўтарэньня леташніх „левых" загібаў як у кантракцыі, у падрыхтоўцы да вясновага севу, так і ў рабоце па колектывізацыі.

Аб прынятых мерапрыемствах і праробленай рабоце, разам з сводкамі аб вясновай пасеўнай кампаніі, а таксама аб рабоце па кантрактацыі інфармаваць.

Сэкратар ЦК ЛКСМБ Паляноў.
13-IV—31 г.

ПЕРАЛОМУ НЯМА

Кулак пад апякунствам опортуністых сабатуе загатоўкі

Сіроцінскі, Старадароскі і Бешанковіцкі раёны далі ільготы кулуку

Цэлы рад раёнаў БССР, ня гледзячы на катэгорычнае патрабаваньне партыйных і савецкіх вышэйшых органаў, ня ўжылі рашучых мер для барацьбы супроць кулацкага сабатажу ў ільназагатоўках. Рад раёнаў дапусьціў грубейшыя выкрыўленьні клясавай лініі, яны ня толькі не спагналі з кулацкіх гаспадарак цьвёрдае заданьне, але далі заданьне ніжэйшае, чым узяла на сябе бядняцка-серадняцкая гаспадарка ў парадку самаабавязацельства.

У радзе цэнтральных газэт конкрэтна адзначаны раёны, якія патуралі кулаку, выкрыўлялі клясавую лінію партыі ў ільназагатоўках. Аднак, гэта ня ўлічана раёнамі, ня ўжыты рашучых захады, каб поўнасьцю выявіць кулацкія гаспадаркі, даабкласьці іх, спагнаць поўнасьцю цьвёрдае заданьне, прыцягнуўшы іх да суровай адказнасьці за сабатаж.

Не пачуты сыгналы аб тым, што рад раёнаў замёр на адным пункце, што крывая выкананьня пляну ільназагатовак ня ўзьнімаецца ўгору.

Сіроцінскі раён адзін з буйных пастаўшчыкоў ільнавалакна. Згодна пляну, ён павінен здаць тэкстыльнай прамысловасьці 600 тон ільнавалакна. Як-жа выконваецца гэты плян? На 25-е сакавіка было выканана 34 проц., а на 5-е красавіка крывая ўзьнялася толькі да 34,2 проц. Раён стаў на мёртвым пункце.

Кулацкім гаспадаркам дадзена 9,3 проц. заданьня да раённага пляну (замест 12—15 проц., згодна дырэктыў партыі). Спагнана з кулацкіх гаспадарак цьвёрдага заданьня на 5-IV толькі 70,5 проц.

Тое самае і з загатоўкай ільнанасеньня. З кулацкіх гаспадарак спагнана ўсяго толькі 43,1 проц. цьвёрдага заданьня, пры сярэднім выкананьні пляну па рэспубліцы на 60 проц.

Па раёне вызначана законтрактаваць 5090 га лёну. На 5-IV плян кантрактацыі выканан на... 15,2 проц.

Бешанковіцкі раён павінен загатовіць 305 тон ільнавалакна. На 25-III—г. г. загатоўлена 35,3 проц., на 5-IV крывая загатовак узьнялася да 36,1 проц. Пянькі загатоўлена толькі 2,4 проц.

Кіраўніцтва Бешанковіцкага раёну дапусьціла буйнейшыя выкрыўленьні клясавай лініі. У раёне выявілі толькі 4,8 проц. кулацка-заможных гаспадарак замест 5,7 проц., абклалі іх на 5,1 проц. раённага пляну (замест 12—15 проц.) і вышла так, што кулацка-заможная гаспадарка куды менш павінна здаць ільнавалакна, чым бядняцка-серадняцкая. Спагнана з кулакоў цьвёрдага заданьня 75,2 проц.—гэтага зьменшчанага пляну.

Раён ні даў ніводнага процанта заданьня кулацкім гаспадаркам для здачы пянькі і лёну.

Плян кантрактацыі лёну даў толькі 12,7 проц. Бешанковіцкі раён, сарваўшы летась загатоўкі лёну, зусім ня думае і не клапоціцца аб тым, каб забясьпечыць 100 проц. кантрактацыю тэхнічных культур на бягучы год. Стара-Дароскі раён далёка адстаў у ільназагатоўках. Так, на 25-III плян быў выкананы на 32,2 проц., на 5-IV—крывая загатовак узьнялася толькі да 33,1 проц.

Раён дапусьціў грубое выкрыўленьне клясавай лініі ў ільназагатоўках. Выяўлена толькі 4,3 проц. кулацкіх гаспадарак, якія абкладзены на 7,8 проц. (замест 12—15 проц.) Бядняцка-серадняцкім гаспадаркам прышлося здаць больш ільнавалакна ў парадку самаабавязацельства, чым кулацкім гаспадаркам у парадку цьвёрдага заданьня. Спагнана з кулацкіх гаспадарак толькі 69,5 проц. зьменшанага цьвёрдага заданьня.

Адказнасьць за гэтыя палітычныя прарывы нясе і комсамольская організацыя. Мы пытаемся сэкратароў Сіроцінскага РК ЛКСМБ—Рутэнбэрга, Старадароскага—Мазо і Бешанковіцкага чаму ў іх раёне да апошняга часу ня выпраўлены меўшыя месца выкрыўленьні клясавай лініі, чаму недаабкладзены і ня прыцягнуты да судовай адказнасьці за сабатаж кулакі, чаму зрываецца кантрактацыя тэхнічных культур бягучага году? Тэрмінова паведаміце рэдакцыю.

Мобілізавалі 85 актывістых на ільназагатоўкі

Плян ільназагатовак па Рагачэўскім раёне на 1-IV выкананы на 22,7 проц. пянькі—12,6 проц., ільнанасеньня—43 проц.

Каб зьняць раён і райком з чорнай дошкі і ліквідаваць прарыў у ільназагатоўках, мы мобілізавалі 85 чалавек комсамольцаў-актывістых. Організавалі 3 брыгады для апрацоўкі лёну.

На кожным бюро заслухоўваем даклады ячэек аб удзеле іх у загатоўках.

Да канца гэтага месяца заданьне будзе выканана.

Сэкратар РК ЛКСМБ П. Ждан.

НЕ ЗАУТРА, А СЕНЬНЯ—

БССР ПАВІННА СТАЦЬ ТАРПЯНЫМ ДОНБАСА…

Сёньня 27 маладых спэцыялістых уваходзяць у строй барацьбітоў за тарпяны Донбас

УДАРНАЕ ПАДМАЦАВАНЬНЕ

Першай і цэнтральнай задачай для выкананьня лёзунгу: „ператварыць Беларусь ў тарпяны Донбас“, каб перавесьці ўсю прамысловасьць Беларусі да канца 5-цігодкі на тарпяны апал, зьяўляецца выкананьне програмы здабычы 705 тыс. тон торпу, як высунула па сустрэчнаму пляну „Чырвоная Зьмена“.

Мэханізацыя торпаздабычы павінна „адыграць рашаючае значэньне ў выкананьні гэтых задач. Пры наяўнасьці значнага недахопу рабсілы, мэханізацыя вытворчасьці, скарыстаньне фрэзэраў значна паскорыць процэс здабычы торпу, узьдыме торпа-прамысловасьць да ўзроўню, які забясьпечыць выкананьне програм 3-га, рашаючага.

Аб рашаючым значэньні мэханізацыі торпапрамысловасьці досыць красамоўна сьведчыць той факт, што шкоднікі ў сваіх плянах асаблівае месца адводзілі зрыву мэханізацыі соцбудаўніцтва.

„Рамзін кажа, што акрамя спазьненьня разьведак і падрыхтоўкі балот, асноўная стаўка была на тармажэньне фрэзэрнага способу здабычы торпу“ (Крыжаноўскі „Шкодніцтва ў энэргетыцы“).

ЦК ЛКСМБ пастанаўляе: „неадкладна разгарнуць падрыхтоўку да пачатку торпсэзону“.

Асаблівую ўвагу неабходна зьвярнуць на выкананьне пастановы ЦК аб мобілізацыі 1000 комсамольцаў для сталай працы на торпзаводах, каб яны (комсамольцы) сталі праваднікамі ўдарных мэтодаў працы, павялі за сабою ўсю масу рабочых торпазаводаў на выкананьне вытворчых пляноў, зрабіліся, пры ўдзеле і дапамозе ўсяго комсамолу, практычнымі выканаўцамі ўсіх мерапрыемстваў па ператварэньню Беларусі ў тарпяны Данбас.

У барацьбе за выкананьне гэтых задач за выкананьне сустрэчнага пляну торпараспрацовак 1931 году, новы атрад спэцыялістых павінен давесьці сваю адданасьць задачам, высунутым пяцігодкаю ў чатыры гады.

Гэты атрад спэцыялістых, падрыхтаваных савецкай навучальнай установай, ёсьць чарговае падмацаваньне торпапрамысловасьці.

Гэта падмацаваньне павінна стаць і стане ўдарным.

АЖЫЦЬЦЯВІЦЬ ЛЁЗУНГ—„БЕЛАРУСЬ—ТАРПЯНЫ ДОНБАС“

1000 комсамольцаў на торпараспрацоўкі, даць пазыку „ператварыць Беларусь у тарпяны Донбас“

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ аб подрыхтоўцы да сэзону торпараспрацовак

1. Лёзунг, высунуты „Ч. З.“ аб „пераводзе да канца 5-цігодкі ўсёй беларускай прамысловасьці на тарпяны апал“ і газэтай „Комсомольская Правда“ аб „ператварэньні Беларусі ў тарпяны Донбас“, зьяўляецца зусім жыцьцёвым і неабходным.

Аб гэтым сьведчыць наяўнасьць у БССР 520 тысяч забалочаных га, запас у 1200 тысяч тон сухога торпу і гэта яшчэ раз падцьвярджае мажлівасьці ажыцьцяўленьня высунутых лёзунгаў.

2. Бюро ЦК лічыць, што ажыцьцяўленьне лёзунгу „ператварыць Беларусь у тарпяны Данбас“ і перавод усёй прамысловасьці БССР да канца пяцігодкі на тарпяны апал залежыць ад выкананьня плянавых заданьняў гэтага году, якія выражаюцца ў 658 тысяч тон, прынятых Белторпам па пляну і сустрэчнаму, высунутаму „Ч. З.“ у 705 тысяч тон. Выкананьне гэтых лічбаў пры разгортваньні бальшавіцкіх тэмпаў работы забясьпечыць у 1933 годзе торпаздабычу па БССР у 4 міл. тон, што адпавядае запатрабаваньню нашай прамысловасьці.

Аднак, падрыхтоўка да торпасэзону разгортваецца надзвычайна марудна. Раённыя комсамольскія організацыі недаацэньваюць значэньне торпаздабычы для БССР. Дрэнна праходзіць вярбоўка рабочае сілы. Торпазаводы не забясьпечаны належным абсталяваньнем, не мобілізаваны ўнутраныя рэсурсы, слаба разгорнуты соцыялістыя формы працы на торпазаводах.

На падставе ўсяго гэтага, ЦК ЛКСМБ пастанаўляе:

1. Неадкладна разгарнуць падрыхтоўку да пачатку торпасэзону. Прапанаваць РК мобілізаваць увагу ўсёй комсамольскай організацыі і рабочай моладзі на ажыцьцяўленьне лёзунгу: „Ператварыць Беларусь у тарпяны Донбас“.

2. Зьвярнуць асаблівую ўвагу на мэханізацыю торпаздабычы і забясьпечыць торпазаводы неабходнымі варштатамі і абсталяваньнем. Завод „Варашылава“ павінен прыкласьці ўсе сілы да таго, каб забясьпечыць своечасовы выпуск патрэбных торпамашын.

3. РК ЛКСМБ павінны забясьпечыць падрыхтоўку і правядзеньне культмасавай работы сярод рабочых торпяньнікаў. Для гэтага патрэбна прымацаваць да кожнага торпазаводу ня меньш як па 2 організатары-масавікі на ўвесь сэзон.

4. Мобілізаваць 1000 комсамольца для сталай работы для торпазаводу. Даручыць оргаддзелу сумесна з экономмасавым аддзелам распрацаваць разьвёрстку па раёнах. Тэрмін сканчэньня мобілізацыі ўстанавіць 5 мая.

Прасіць Белторп організаваць спэцыяльныя тыднёвыя курсы для мобілізаваных комсамольцаў, накіраваўшы іх у якасьці дзесятнікаў, культработнікаў і г. д.

Лічыць неабходным організацыю спэцыяльнага комбінату па падрыхтоўцы кадраў для торпянай прамысловасьці.

5. Прапанаваць вытворчым колектывам ЛКСМБ, прадрыемствы, якія знаходзяцца на тарпяным апале, правесьці адпаведную работу з тым, каб перавесьці прадпрыемствы на апал фрэзэрным торпам, цесна ўвязаць усю сваю работу з ячэйкай ЛКСМБ торпазаводу, пераносячы туды вопыт па організацыі соцыялістычных форм працы і барацьбы за прамфінплян.

Улічваючы дрэннае становішча мясцовага транспорту для перавозкі торпу, прапанаваць усім комсамольскім організацыям узяць яго пад сваю асаблівую ўвагу, організуючы рад масавых мерапрыемстваў для правільнай і плянавай работы транспорту.

6. Адобрыць ініцыятыву „Ч. З.“ і „Комсомольской Правды“ аб стварэньні ўсесаюзнага кантролю над ажыцьцяўленьнем лёзунгу: „ператварыць Беларусь у тарпяны Донбас“. Прапанаваць комсамольскім організацыям Хэміка-тэхнолёгічнага тэхнікуму, Горацкай Акадэміі, ВСНГ, Дзяржплану, Белкоопсаюзу і інш. тэрмінова ўключыцца ў правядзеньне гэтага кантролю. Прапанаваць РК ЛКСМБ аказаць усямерную дапамогу „Ч. З.“ і „Комсомольской Правде“ у організацыі скразнога кантролю і пастоў.

7. Патрымаць ініцыятыву „Ч. З.“ аб выпуску спэцыяльнай унутры-рэспубліканскай пазыкі „ператварыць Беларусь у тарпяны Данбас“.

Прасіць НКФ і ЦВК аб выпуску пазыкі.

8. Праз месяц праверыць выкананьне гэтай пастановы.

27 піонэраў мэханізацыі вытворчасьці

Стары, мала мэханізаваны машынафармовачны спосаб здабычы ні ў якім разе не забясьпечыць узятых тэмпаў узьняцьця торпапрамысловасьці.

Як у вугальным Донбасе кірка ня можа забясьпечваць выкананьне лічбаў 5-цігодкі бяз урубавай машыны, так і ў тарпяным Донбасе ўрубавай машынай павінен быць фрэзар, малы і вялікі гідратар, якія паскараюць процэс здабычы зьмяншаюць колькасьць рабочага абслугоўваючага пэрсоналу ў 25-30 разоў у параўнаньні з машынафармовачным спосабам, значна палягчаюць цяжкую працу рабочага-тарпяніка.

Пры значным недахопе рабсілы, якая значна адчуваецца ў торпапрамысловасьці, мэханізацыя торпаздабычы адыграе рашаючае значэньне ў справе выкананьня вытворчых програм 3-га рашаючага году. Мэханізацыя панізіць сабекошт торпу і гэтым самым зробіць яго яшчэ больш рэнтабельным у параўнаньні з іншымі відамі апалу.

Мэханізацыя торпаздабычы ўпіраецца ў адсутнасьць кваліфікаваных кадраў. Выпускаемыя сёньня 27 тэхнікаў торпапрамысловасьці павінны адыграць значную ролю ў справе мэханізацыі торпаздабычы. 27 тэхнікаў добра падрыхтаваных, знаёмых з апошнімі дасягненьнямі тэхнікі торпаздабычы, адыграюць значную ролю у барацьбе за мэханізаваны „тарпяны Донбас“.

Старшыня профкому Кувіцкі.

Новых спэцыялістых неабходна скарыстаць у тэхнічнай перабудове торпаздабычы, каб забясьпечыць выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну торпапрамысловасьці на новай узмоцненай тэхнічнай базе.

Новыя спэцыялістыя павінны будуць змагацца за мэханізацыю разам з усімі працаўнікамі торпапрамысловасьці, шчыльна зьвязаўшыся ў сваёй штодзеннай працы з грамадзкімі організацыямі, навучальнай установай, Белторпам.

Пачатак зроблены. Выпускнікі ўключыліся ў рады пастоў „Чырвонай Зьмены“ па скразному кантролю мэханізацыі беларускай торпапрамысловасьці.—

Г. Лагуноў.

Быць прыкладам ударнай працы

15-га красавіка г. г. беларуская торпапрамысловасьць атрымоўвае першы атрад тэхнікаў.

Гэты выпуск меў шмат цяжкасьцяй у сваёй вучобе. Адсутнічалі спэцыялістыя выкладчыкі, недастатковы былі абсталяваны лябараторыі і габінэты. Але ня гледзячы на ўсе гэтыя цяжкасьці выпускнікі добра падрыхтаваны для самастойнай працы на вытворчасьці.

Дзякуючы сапраўды ўдарнай працы выпускнікоў, шырокаму разгортваньню соцспаборніцтва і ўдарніцтва—якасьць выкананьня навучальнага пляну добрая. Аб гэтым адзначалі і спэцыялістыя, якія прыяжджалі з Масквы для выкладаньня спэцыяльных дысцыплін.

Соцыяльны склад выпускнікоў клясава вытрыманы. Гэта—у большасьці рабочыя, дзеці рабочых і сялян-беднякоў. Яны добра разумелі пастановы партыі і ўлады аб падрыхтоўцы пролетарскіх кадраў.

У барацьбе за выкананьне і перавыкананьне програмы торпаздабычы гэтага году, выпускнікі павінны наказаць прыклад сапраўды ўдарнай працы чырвоных спэцыялістых.

Дырэктар Менскага Хэміка-Тэхнолёгічнага тэхнікуму Цэмехман

МІНАЮЦЬ ГАД…

1928/29 г. г. Пры Менскім по… вікуме адчынілася аддзяленьне з… пяным ухілам. З ліку прыняты… студэнтаў—25 комсамольцаў. … зу-ж комсамольцы тарпянікі па… юць барацьбу з дрэннымі наст… сярод некаторай часткі студэн… за наладжваньне ўдарнае вучобы…

Другая палова навучальнага … У тарпянікаў сьвята. Організава… асобная комсамольская ячэйка. … самольцы больш упарта змагаюц… палепшаньне вучобы і згур'оў… вакол сябе беспартыйных студэ…

Соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў … дзённай працы. Курс цалкам пас… хова канчае вучобу.

1929/30 г. г. Тарпянікаў прыбы… Ужо існуюць 2 курсаў і два ў… прамысловы і сельска-гаспада… Усяго навучаецца 60 асоб, з і… комсамольцаў.

З пачатку новага навучальнага … адчуваюцца сур'ёзныя недахопы: … сутнасьць спэцыялістых выкладчы… на торпу, дрэнная пастаноўка выт… чай практыкі, непрыстасаванасьці… запатрабаваньняў, няжыцьцёвасьце… вучальных програм.

Студэнты тарпянікі, на чале з … самольскай ячэйкай, пачынаюць ш… маваць гэтыя недахопы.

Ня гледзячы на гіронічныя заў… некаторых працаўнікоў тэхнікуму … носна няжыцьцёвасьці гэтага м… прыемства, комсамольская ячэ… прыцягнуўшы спэцыялістых, давод… жыцьцёвасьць гэтага мерапрыемс… разам з палепшаньнем якасьці на… чальных програм.

Тарпянікі організоўваюць шы… кую вытворчую нараду з удзелам … цыялістых адміністрацыі і гаспадар… устаноў, на якой дэталёва абгав… ваецца становішча тарпянага ад… леньня. На гэтай нарадзе былі ўзя… пад абстрэл сур'ёзныя недахопы … няй вытворчай практыкі, якая ад… валася ва ўстановах НКЗ, зацьвер… жаецца пераход на 3-х гадовы тэр… навучаньня і намячаецца рад конкр… ных мерапрыемстваў для палепшань… навучаньня.

Яшчэ з пачатку навучальнага го… тарпянікі уступілі у спаборніцтва … дарожным аддзяленьнем полі ехніку… Дзякуючы гэтаму, курс справіўся … задачай; ня было ніводнага студэнта … нязланай дысцыплінай.

1930-31 г. тарпяное аддзялень… пераводзіцца ў новаарганізаваны Х… міка-Тэхнолёгічны тэхнікум.

Зараз на тарпяным аддзялен… тэхнікуму на ўсіх курсах займаец… 175 студэнтаў, з іх; рабочых і дзяц… рабочых—110, комсамольцаў і парт… цаў—98, дзяўчат—35. Зараз тарпян… аддзяленьне мае 32 выкладчыка, … іх 12 спэцыялістых па торпу.

Як відаць тарпяное аддзяленьне тэ… нікуму ўжо досыць моцнае як … ахопу студэнства, так і па ўкомпле… таваньню настаўніцтвам, гэта—нав… чальная установа, якая ўжо дал… тарпянай прамысловасьці Беларус… першы атрад працаўнікоў.

15-га красавіка 27 тэхнікаў-тарп… нікаў, на 2 тыдні раней вызначана… тэрміну, канчаюць вучобу і ўключаю… ца ў практычную працу. Па асабіста… ініцыятыв студэнты выпускнікі вы… каналі для патрэб Белторпу вытворчы… проэктаў на 30 тысяч рублёў.

Організацыя самастойнага тарпяна… тэхнікуму, ці адзінага вучэбнага ком… бінату па падрыхтоўцы тарпянікаў —справа сёньняшняга дня.

Выпускнікі абяцаюць у сваёй што… дзённай працы дапамагаць узма… неньню першай на Беларусі установы па падрыхтоўцы кадраў тарпяной прамысловасьці.

Язэп Энцін

ЯНЫ СЁНЬНЯ ЎВАХОДЗЯЦЬ У БАЯВЫ СТРОИ



Група прэміяваных ударнікаў выпускнікоў

Літаратурная старонка

Ул. Маякоўскаму

Разьюшаным
шумам
Хвалі
гамоняць.
На сьпіне ў іх
шастае
Крэйсэр...
Мы едзем
на ім
І пяём свае
новыя
песьні,
Ідучы
ужо
сонечным
рэйсам
Социялістычнага
прадвесьня!
Ты гэта
бачыў...
Нашто-ж
пасваволіў?!
Паплыў
у вірлівы туман
чорнае
плесені,—
ня ўзяўшы
на тое
дазволу...
Так...
Раставаньне...
Жалем
бядуем...
поэты няма...
Усё-ж
тваё
возера слоў
Ніагарыць,
глянь,
з намі!
Жыцьцёвае
мора
дынаміць
нябачана!
І агністыя
дні
Нашай
творчай
вясны...
Крэйсэрам
ў хвалях
маячаць!..

М. Вісажар

16—IV-31 г.
Менск

ВЯЛІКІ ПОЭТА РЭВОЛЮЦЫІ

(Да гадавіны з дня сьмерці Ул. Ул. Маякоўскага)

Пускай нам
общим памятником будет
построенный
в боях
социализм.

Сёньня—роўна год з дня трагічнай сьмерці Ул. Ул. Маякоўскага, аднаго з лепшых творцаў пролетарскай літаратуры.

Прайшоў здаецца невялікі час пасьля нявыбачнага стрэлу ў сэрца, але гэты абмежак часу ў краіне саветаў поўны вялізарных экономічных і палітычных зрухаў.

Пролетарыят і працоўныя масы краіны саветаў, пад кіраўніцтвам ленінскай партыі, з посьпехам закончылі другі год 5-цігадовага пляну будаўніцтва социялістычнай экономікі і культуры, уступілі ў 3-ці рашаючы і пераможна ператвараюць экономіку, старую заржавелую тэхніку замяняюць мэталічнымі сыстэмамі машын. Нябачанымі ў гісторыі тэмпамі творыцца жалезна-бэтонны будынак комунізму.

Якраз у гэты момант будаўніцтва социялістычнай гаспадаркі і культуры, нявыбачны стрэл вывеў з строю франтавіка пролетарскай літаратуры, аднаго з яе вялікіх будаўнікоў.

Шлях Ул. Маякоўскага—складаны шлях. Ён перапоўнены бяздоньнямі буржуазнай культуры. Маякоўскі пасьлядоўна крочыў за ім. Ён асна разумеў цяжкасьці на сваім творчым шляху. Таму ён гаварыў:

Но я
себя
смиряя,
становясь
на горло
собственной песне".

У поэты Маякоўскага было шмат рэштак ад былога старога, буржуазнага. Гэтае старое Маякоўскі імкнуўся зьнішчыць і зьнішчаў, наступаючы на „горло собственной песне".

Ад вершаў, у якіх поэта толькі хваліў рэволюцыю, ён пераходзіць да такіх твораў, як поэма аб Леніне, „Облако в штанах", „Хорошо", „150.000.000" і іншыя; становіцца на шлях пролетарскай рэволюцыі і заяўляе:

„Я с теми,
кто вышел
строить и месть
В сплошной
в лихорадке будни",



На сваім творчым шляху Маякоўскі глыбамі адкідаў буржуазную культуру:

„Мы
тебя доканаем,
мир романтик!
Вместо вер—
в душе
электричество,
пар.
Вместо нищих
Всех миров богатства прикарманьте.

Імпэрыялістычную вайну Маякоўскі ўспрыняў нутром бальшавіка, зразумеў у ёй усю расстаноўку клясавых сіл. У гэтай расстаноўцы клясавых сіл у Маякоўскага кіпела ненавісьць да буржуазіі, а таму яго „Война и мир"—шлях да Кастрычніка.

Кастрычнікавую рэволюцыю поэта ўспрыняў социяльна-акрэсьлена.

Аб успрыманьні Кастрычніка Маякоўскі гаворыць наступнае:

„Прымаць ці ня прымаць? Такога пытаньня для мяне ня было.

Мая рэволюцыя. Пашоў у Смольны. Працаваў. Усё, што прыходзілася."

Будучы поэтаю, які ярка гарыць лірычным полымем, Маякоўскі аб рабоце поэты гаварыў так:

„У нас
поэт события берет—
опишет вчерашний гул,
а надо
рваться в завтра,
вперед,
чтоб
брюки
трещали
в шагу".

І сапраўды творчы шлях і сама творчасьць Маякоўскага, асабліва апошняга часу, шмат у чым—добры прыклад для нашых поэтаў і пісьменьнікаў.

Асуджаючы ўчынак Маякоўскага, нашыя поэты, маладыя рабочыя-ударнікі, якія ідуць у літаратуру, павінны вывучыць і скарыстаць усё лепшае з творчасьці Маякоўскага.

Ул. Ул. Маякоўскі ў сваім жыцьці быў блізкі да рабочых колектываў фабрык і заводаў, да варштатаў і іх камандыраў, да моладзі і дзяцей-піонэраў.

Моладзі і піонэрам Маякоўскі напісаў шмат баявых песень, якія будуць доўга жыць.

Лепшае, пролетарскае ў поэзіі Маякоўскага зойме месца ў скарбніцы пролетарскай культуры. Зьдзейсьніцца надзея Уладзімера Уладзімеравіча, якую ён выказаў у словах:

„Мой стих
трудом громаду лет прорвет
и явится
весомо,
грубо
зримо,
как в наши дни
вошел водопровод,
сработанный.
еще рабами Рима.

П. Скенаў.

Рабочая вясна

Андрэй Ушакоў

Рысакам у даль зіма прабегла,
Дні прыйшлі вясновае красы.
Зазьвінела гулкім звонам цэгла,—
І растуць няспынна карпусы

На усходнях,
Пад напевы ветру,
Я іду імпэтным муляром,
Каб ізноў на два з паловай мэтра
У гару за дзень узьняўся дом.

Мне прыемна ў працы маладому,
Поўнаму бурлівых, творчых сіл,
Разам з гэтым, велічэзным домам
У неабсяжную ўразацца сінь.

Залатое сонца з паднябесься
З рыжаю шчаціною вусоў
Ласкава ў абдымках песьціць
Сьцены нова ўзрослых карпусоў.

А калі хадой нячутнай вечар,
У сіняй блюзе плаўна падыйдзе,
Будуць ныць натружаныя плечы,
Што ад працы натаміў за дзень.

І тады я сэрца супакою,—
Што і я бурлівым муляром
Гэтай вось мазольнаю рукою
Уздымаў з другімі ўгору дом.

Дзень за працай робіцца кароткім
Рысакамі прабягаюць дні
Рад я тым, што ў будніх пяцігодкі—
Нараўне з другімі будаўнік!

Колгас „Профінтэрн".



Поэта Маякоўскі ў гасьцях у чыр-вонаармейцаў у Кастрычнікавых лягерах

Радасьць

Андрэй Бязьменны

(Урывак з аповесьці „Зялёная вада")

Павуціваю на плоце павіс вечар. Апошняя прозалаць зайчыкам саскочыла з чорных сьцен дэпо і растала ў сутоньні. Некалькі хвілін, бы на шалях, вечар пераважваў дзень.

Гіры хісталіся. А калі паволі туман і дым, што назьбіраўся за дзень, белаю крыгаю споўз на велічэзную чашку шаль,—вечар пераважыў дзень. Сутоньне зьмыла ружовасьць з неба, бы вугалі пасьля пажару датлелі і не гараць чырваньню. А цяпер застаўся халодны прысак—шэрыя хмары. Было прахладна.

Можа што вячэрняя сьвежасьць аддала раптам холадам, тады ўсплылі думы. Запрацуе дэпо! Пашырым, значца! Новых рабочых прымуць—моладзь з фабзавучу. Старыя—што: сямья, клопат рэзьвіны. Ім 7 гадзін адбарабаніў і ўсё. Яны ведаюць толькі сваю працу, а ў грамадскую працу ўцягнуць цяжка. Яшчэ з старой закваскай. А тут трэба катаць на ўсе гайкі, каб усё трашчэла!..

І, рвануўшыся з ганку, разгульна адкрыўшы грудзі, зашагаў да станцыі.

Сьцямнела.

Уздоўж станцыі—рознакалёрныя агні Мігаюць, гараць, усьміхаюцца. Пагледзеўшы на іх, робіцца весела, весела. Усё акаляючае даходзіць да нутра і настройвае сэрца на гармонічны лад...

Відно:

Вялізманым дрэвам кучаравілася труба. Жоўтым дымам з дэпоўскай электрастанцыі. За плотам—вугальны склад. Там чмыхаюць цягнікі. Гулка, хуценька пырскаюць сьмехам і бягуць ўдаль.

Глянеш на дачачыны,—шырокі размах імкненьняў. І адтаго хочацца пабегчы ўсьлед і крыкнуць:

— Шырокі размах працы! Шырокі прастор зямлі! Прымі мяне да сябе, я пабягу за цягнікам у прасторы! А ў цемені аркаю ўздымаецца эстокада для вугалю. Лётае пад'ёмны кран, падымаючы гружаныя вугалем кадкі, а ў цемені гэта здаецца, нібыта нехта вялікімі вёдралі чэрпае з студні ваду. За складам бягуць саставы, чырвоным трыкутнікам гараць ліхтары. І хочацца Касмачу зьдзець шапку, махаць усьлед таварнаму і радавацца ад душы.

— Гэта значыць: павязуць некуды эшалёны бярвеньня, пабудуюць машыну, а жняяркай сажнуць недзе новы ўраджай.

— Эх, прастор чыгункі! Ну, як ня радавацца, як не кахаць цябе?!, Як не аддаць і сэрца і пачуцьці табе, родная чыгунка!

А чаму родная?

І выплыла тады ў памяці:

З малых год тут жыў, з горам і пакутаю парадніўся, зросься з ёю, як сэрца з часткамі ўсяго цела. Чалавек прывыкае да працы, з ёю разам пераносіць гора і крыўду, смутак і радасьць, пазнае са раўднасьць жыцьця. Касмач, ці што гады немаладыя, паставіў каўнер паліто і стаў на ганку дэпоўскае сталоўкі.

Выходзілі з вытворчае нарады. З потнымі тварамі згрудзіліся ля ганку, шумелі і спрачаліся. Але Касмач сёньня пасьля сходу ня прыняў удзелу ў спрэчках. Аблакаціўшыся на парэкладзіну ганку, задуменна глядзеў у даль. Хацелася адпачыць. За дзень намарудзіў рудзі і рукі,—а зараз-бы ў цішы сядзець і адчуваць, як павольна прыплывае растрачаная за дзень над працай сіла.

Не такі час сядзець зложыўшы рукі, калі ўсё кіпіць жыцьцём, ідзе наперад. Як усядзець самаму, як не пабегчы разам з усімі і ня крыкнуць:

— Я з вамі разам! Хадзем! Гэй, шпарчэй там крок! Запявала, зацягвай песьню!

Касмач першым з усіх спазнаў горач жыцьця. Таму трэба імкнуцца наперад, да лепшага, нешта тварыць. Сумленьне не дазваляе сядзець!

Ужо паўсотні за плячыма, як верставых слупоў, пражытых год, а ён падарожнікам з торбаю—жыцьцёвымі пакутамі і радасьцю—мінуў іх, и дае ня прысеўшы, бо пакуль сіла ёсьць і гэта шырокая жыцьцёвая дарога заве ў даль,—трэба ісьці.

— На пэнсію-б вам, Ігнатавіч! Адпачыць-бы не пашкодзіла. Старасьць падыходзіць!

На Касмача так часам кажуць рабочыя.

— Эйт! Яшчэ ня хутка прыстаць, таварыш! Сып у качагарку вугаль, працуй! Вось яшчэ!—тады падымае ўгару рукі і напружвае мускулы!

— Ня сорам! Маладыя, а пра адпачынак думаюць.

І той, хто сказаў пра адпачынак зачароміцца. Не па вастрою сказаў Ігнатавіча. Стары вунь як хоча працаваць! А тут пра пэнсію ўспамінаюць і ніякавата перад старым робіцца. Вось так бы самому разгульна грымець —працаваць. Тады рабочы адыходзіць к ціском паднаціснуць у працы, каб чыстым засталося сумленьне...

Даўно заціхлі галасы ўшоўшых, а Касмач стаіць на ганку і глядзіць у даль. Захацелася падумаць аднаму аб тым, каб сім каб ніхто не перабіваў.

10-гадовы пайшоў Юрка (так звалі Касмача) н чыгунку ў дэпо вучнем. Пасьля вярцелася вялікае кола жыцьця і ён быў адной з сьпіц кола, кружыўся разам з жыцьцём. Хілы слабенькі працаваў па 11 гадзін у дзень.

Галава—стопудовы цяжар, цела драньцьвела. ад працы А працаваць трэба.

Тады моладзь жыла ня так, як цяпер. Зараз і школы розныя і фабзавучы,—усё ў меру. А тады... Цяжка ўспамінаць. За 5 год вучнёўства майстар нічому не навучыў. За папяросамі, ды за гарэлкай пасылаў, увесь час напіваўся і за вушы драў.

А каму паскардзіцца? Боязна, яшчэ праганяць. Быў выпадак—п'яны майстар больна выдраў за вушы. Маленькім зьвярком сагнуўся Юрка ў камячок і ад крыўды і болю заплакаў. І першы раз у галаве зьявілася запытаньне;

— За што! У чым я вінаваты?!... Адказу не знайшоў—глядзелі п'яныя вочы і тлусты твар майстра. Майстар агадае працаваць, а як працаваць? Ці паказаў яму калі хто, як працаваць! І ня вытрымаў—пабег да дому. Расказаў аб крыўдзе—матчына сэрца зразумее. Хворая маці ласкаю прыгалубіла, пацалавала, і тады горка-горка заплакала. Гэта азначала.

— Крыўдзяць цябе мой сынок... Ведаю, цяжка. А як-жа жыць будзем? Юрка зразумеў. У сьлёзах прачытаў матчын роспач,—зноў пайшоў на працу. Так было ня раз. Таму можа пасьля пераж тых нягод—чыгунка стала роднай і блізкай. Таму і праца такая каханая. Бяз працы ён—як бяз сэрца. Пасьля пакуты ўсягды бывае шырокая радасьць. А цяпер інакшае жыцьцё, яно дае натхненьне ў працы, прыносіць у жыцьцё радасьці! І як маламу дзіцяці зрабілася прыемна, як ніколі, ад усяго перадуманага. Дрэннае ўсё ззаду, — а наперадзе — змаганьне і праца! . . . .

Набліжаўся горад. Ярчэй гарэлі агні

Да другой гадавіны соцспаборніцтва

У першых радох социялістычнага будаўніцтва



Пастанова ЦК Усе КП(б) і СНК СССР аб чыгуначным транспорце ўзьняла сярод комсамольцаў чыгункі новую хвалю ініцыятывы, соцспаборніцтва і ўдарніцтва ў барацьбе за рэконструкцыю чыгуначнага транспорту, за здаровы цягнік.

Комсамольцы дэпо Гомель організавалі скразную ўдарную брыгаду па рамонту цягнікоў. Брыгада складаецца з комсамольцаў і працуе пад кіраўніцтвам брыгадзіра—былога фабзайца Макарэвіча.

Брыгада ўключылася ў конкурс на лепшы рамонт. За два месяцы працы брыгада ня мае ніводнага паўторнага рамонту.

Па водзыву машыністых адрамантаваныя гэтай брыгадай цягнікі ня трэба правераць у час паездкі.

У падрыхтоўцы да Усебеларускай транспортнай нарады моладзі комсамол дэпо-Гомель павінен распаўсюдзіць вопыт лепшых, зьнішчыць недахопы.

На здымку: ударная брыгада рамонту цягнікоў дэпо-Гомель. Зьлева брыгадзір Макарэвіч.

У вогнішчы клясавых бояк

Пролетарыі Захаду рыхтуюцца да міжнароднага рэволюцыйнага дню

Социял-ашуканцы

БЭРЛІН. 12. У буйнейшай друкарні Нямеччыны, ў концэрне Ульштэйна ў Бэрліне адбыліся выбары фабзаўкому. Упяршыню выстаўлены сьпіс рэволюцыйнай профопозыцыі атрымаў 1.544 галасы, сьпіс рэформістых таксама 1.544 галасы. Гэтае супаданьне колькасьці галасоў выклікала ў колах рабочых концэрна вялікую падазронасьць ў тым, што выбарчая камісія, якая складалася выключна з рэформістаў, і тут, як ужо ў шмат якіх выпадках, прыбегла к ашуканству. На кабельным заводзе электрыкі „А. Э. Г." („Усеагульная кампанія электрыкі") у Бэрліне рэформісты таксама прыбеглі к ашуканству. У той час, калі галасавала 3.068 рабочых пры адчыненьні урны знайшлі 3.140 галасоў. У час падлiку галасоў 50 галасоў зноў зьнікла. Паводле агалошанага рэформістымі выніку рэволюцыйная профопозыцыя атрымала 1.359 супроць мінулага году 1.662 галасы, рэформістыя—1.374 (у мінулым годзе—1.142), каталіцкія профсаюзы—152, нацыянал-социялістыя (фашысты)—82 галасы.

Рэволюцыйная профопозыцыя опротэставала гэтыя выбары. Выкрытыя факты сапраўднага ашуканства з боку рэформістых на турбінным і кабельным заводах «АЭГ» ў Бэрліне яскрава дэманструюць усе мэтоды, пры дапамозе якіх соц. фашыстыя спрабуюць захаваць свае месцы ў фабзаўкомах.

„Забаранію"...

БЭРЛІН, 12. Начальнік бэрлінскай паліцыі соц.-дэмократ Гржэзінскі забаранію дэмонстрацыю комсамолу ў Люстгартэне, якая павінна была адбыцца 15 красавіка.

Конфіскацыя...

БЭРЛІН, 9. Бэрлінскі начальнік паліцыі социял-дэмократ Гржэзінскі аддаў загад аб конфіскацыі брошуры „Працоўнае сялянства Эўропы на шляху к рэволюцыйнаму дзеяньню". Гэтая брошура выдана Эўропейскім сялянскім камітэтам і зьяўляе рашэньні другое сэсіі гэтага камітэту, якая адбылася ў сьнежні м-цы 1930 г.

32 мітынгі супроць дыктатуры Брунінга

БЭРЛІН. 12. За апошнія дні акруговы камітэт беспрацоўных рэволюцыйнай профопозыцыі ў Бэрліне організаваў 32 мітынгі протэсту беспрацоўных супроць дыктатуры ўраду Брунінга і супроць рыхтуемага выданьня новых дыктатарскіх дэкрэтаў, накіраваных супроць беспрацоўных. Гэтыя перапоўненыя мітынгі адначасова зьяўляліся падрыхтоўкай чырвонага адзінага фронту к 1 мая.

У краінах капіталістычнага „працветаньня"



Беспрацоўны на вуліцы Гамбургу

Амэрыканская дэлегацыя—к 1-му мая

НЬЮ-ЁРК. Дэлегацыя рабочых ПАЗШ, якая будзе прысутнічаць на першамайскіх урачыстасьцях у Маскве, складаецца з 32 чалавек. Пасылку дэлегацыі організуе т-ва прыхільнікаў СССР.

Ад'езд дэлегацыі ў СССР прызначаны на 15-IУ.

Да юбілею засталося 12 дзё

10-гадовы юбілей „Ч З."—сьвята комсамолу Беларус

Хоцімскі, Капыльскі, Тураўскі райкамолы недаацэньваюць важнасьці падрыхтоўкі да юбілею, ігнаруюць пастанову ЦК ЛКСМБ аб давядзеньні тыражу „Чырвонай Зьмены" да 60 тысяч

Ва ўсю шырыню разгарнуць масавую падрыхтоўку да юбілею

Да 10-цігадовага юбілею „Чырвонаа Зьмены" засталося ўсяго 12 дзён. Аднак на мясцох падрыхтоўка працякае вельмі марудна. Правядзеньне юбілею „ЧЗ" яўна недаацэньваецца. У Капылі, Тураве, Хоцімску ды інш. раёнах маса комсамольцаў і беспартыйнай працоўнай моладзі ня мае ніякага ўяўленьня аб юбілеі.

Адгэтуль задача: рэшту часу скарыстаць сапраўды пабаявому, разгарнуць належную масава-палітычную працу навокал юбілею.

Вечар, прысьвечаны юбілею „ЧЗ", які правёў колектыў Белдзяржбуду, павінен стаць вопытам для ўсяе організацыі КСМ. Гэта мерапрыемства трэба перанесьці ў кожны колектыў КСМ і ў кожную ячэйку саўгасу і колгасу.

З ўсёй настойлівасьцю павінна быць завострана ўвага на выкананьне пастаноў бюро ЦК аб павялічэньні тыражу „ЧЗ" да 60 тысяч экзэмпляраў, аб тым, што кожны комсамолец чытае свой баявы орган—„Чырвоную Зьмену".

Юнкораўская маса ў адзнаку юбілею „ЧЗ" павінна правесьці самаправерку дзейнасьці нізавога друку. Высьвятліць, які ўдзел прымае ён у ажыцьцяўленьні лёзунгаў партыі і адозвы „ЧЗ" аб тым, каб у кожным саўгасе, колгасе, МТС была шматтыражка ці насьценгазэта. Трэба разгарнуць шырокую работу на старонках шматтыражак і насьценгазэт па ўцягненьню ў рады юнкораў ударнікаў вытворчасьці, саўгасаў і колгасаў.

Вось дзе добра рыхтуюцца

Да 10-цігадовага юбілею „Ч. З Недальская комсамольская ячэйка (Б гомельскі раён) распаўсюдзіла сяр моладзі 75 экзэмпляраў „Ч. З.". Н год падпісаліся 20 чал., а астатнія н 3 месяцы.

У сельсавеце і вёсках праведзен сходы моладзі аб 10-цігодзьдзі „Чыр вонкі" і барацьбе за 60-тысячны ты раж яе.

Ячэйка склала плян правядзеньн юбілею „Ч. З." 25 красавіка будз праведзена конфэрэнцыя—дыспут мо ладзі і чытачоў „Ч. З." з мэтай згур таваць юнкораў і працоўную моладз вакол баявога органу ЦК ЛКСМБ на шай „Чырвонкі".

Да дыспуту выпускаецца спэцыяль ная насьценгазэта, якая павінна цалкам асьвятліць вынікі працы „Ч. З.", як організатара шырокіх мас комсамолу і працоўнай моладзі на правядзеньне ў жыцьцё генэральнай лініі партыі.

Ячэйка організавала пры колгасе „Комінтэрн" пост „Ч. З." і шырока разгарнула падрыхтоўку да яе 10-цігадовага юбілею.

Я. Бабіцкая.

Ударнікі рыштаваньняў у адзнаку юбілею „ЧЗ" ідуць у комсамол

10-га сакавіка ў доме комсамолу адбыўся вечар, прысьвечаны 10-цігодзьдзю „Чырвонкі".

Першае, што кідаецца ў вочы пры ўваходзе ў залю, гэта—выстаўка малодшага брата „Чырвонкі"—насьценгазэты ільлічоўкі „Голас Будвучу". Па гэтай выстаўцы можна меркаваць аб тым, што вучні вакол сваёй газэты вядуць вялікую працу.

Дакладчык з рэдакцыі, т Глезэр, разгарнуў перад прысутнымі ўвесь шлях працы і барацьбы „Чырвонай Зьмены" за перабудову народнае гаспадаркі і выкананьне 5-цігодкі ў 4 гады. Ён паказаў наколькі „Чырвоная Зьмена" зрабілася організатарам рабочае моладзі вакол важнейшых гаспадарча-палітычных задач нашай краіны.

Пасьля дакладу „Чырвонкі" была заслухана справаздача малодшага брата „Чырвонай Зьмены"—„Голас Будвучу". З справаздачы стала яскрава цесная сувязь і дапамога „Чырвонкі" насьценгазэце.

Школьная ільлічоўка мае шмат дасягненьняў. Дзякуючы ёй выпрацаваны праграмы для ўсіх курсаў, праводзяцца ў жыцьцё вытворча-акадэмічныя манэўры, ударніцтва і соцспаборніцтва—усё гэта знайшло асьвятленьне на старонках „Голасу Будвучу".

На гэтым вечары было пададзена 16 заяў у комсамол. 16 лепшых маладых ударнікаў з рыштаваньняў уступілі ў комсамол у адзнаку 10-цігадовага юбілею „Ч. З.".

Вечар, праведзены комсамольскай ячэйкай Будвучу, яскрава паказаў усю зацікаўленасьць маладзёжнай масы „Чырвонкай", непасрэдную сувязь і дапамогу „Чырвонай Зьмены" у штодзённай працы комсамолу і рабочай моладзі.

Ініцыятыва комсамольскай ячэйкі Будвучу павінна быць падхоплена астатнімі ячэйкамі і колектывамі.

Самапрытыкоўскі.



МІНКІН З.

рэдактар шматтыражкі „Рабочая Вока" заводу „Бальшавік", стары юнкор „Ч. З."

Мала асьвятляецца праца вайсковага комсамолу

Гаворачы аб дасягненьнях „Чырвонкі", трэба падкрэсьліць і недахопы яе. Першы—у тым, што газэта мала зьмяшчае вопыту добрай працы комсамольскіх організацый, на якім можна было-б вучыцца другім. Таксама мала друкавалася і аб вопыце працы вайсковага комсамолу. Дагэтуль ня было яшчэ тэхнічнай старонкі, а яна зараз неабходна ў зьвязку з высунутым лёзунгам паходу за тэхніку.

Пучынскі.

У падарунак Х-годзьдзю наладжваем працу ў колгасах

У адзнаку 10-цігадовага юбілею газэты „Чырвоная Зьмена" юнкоры мястэчка Старасельле організавалі ўдарную юнкораўскую брыгаду імя „Ч. З." і разгарнулі шырокую масавую працу па прасоўваньню „Ч. З." у масы. Кантрольныя лічбы па выпісцы „Ч. З. ужо перавыкананы. Замест 48 экзэмпляраў, мы маем 54.

У колгасах „Пролетары", „Зара", „Новае жыцьцё", „Социялізм" і „Бальшавік" пры непасрэднай нашай дапамозе колгасьнікі разьбіты на ўдарныя брыгады па ўсіх галінах працы.

Выклікаем на соцспаборніцтва ўсіх юнкораў і юнкор-брыгады „Ч. З."

Ударная юнкор-брыгада „Ч. З."
Генін, Росмам, Арэшка.

Калі не забудзе, дык правядзе

Падрыхтоўчая праца да Х-годзьдзя „Ч, З." у Тураўскай комсамольскай організацыі не праводзіцца. Хаця гэтае пытаньне стаяла на бюро РК ЛКСМБ, дзе была прынята пастанова правесьці 4 падраённыя конфэрэнцыі па юбілею „Ч. З.". Але, нажаль, гэта пастанова так і засталася толькі пастановай. Ніводная з комсамольскіх ячэек да юбілею яшчэ не пачала падрыхтоўкі.

Характэрны погляд на гэтую справу апорга РК ЛКСМБ, т. Кучынскага. На запытаньне ці будзе сэкратар РК т. Шапіра праводзіць падраённую конфэрэнцыю, Кучынскі адказаў: „Калі не забудзе, дык правядзе".

Адгэтуль зусім ясна тая нядбайнасьць, з якою глядзяць на гэта важнейшае пытаньне некаторыя комсамольскія працаўнікі з складу РК ЛКСМБ, у той час, калі прасоўваньне „Чырвонай Зьмены" у гушчу комсамольскай і беспартыйнай масы ідзе слаба.

Трэба зараз-жа рашуча ўдарыць па такіх поглядах комсамольскіх кіраўнікоў, якія недаацэньваюць юнацкі друк.

Пост „Ч. З." Міхась

Падрыхтоўка не разгорнута

Маслакоўская і Анікоўская ячэйкі комсамолу (Капыльскі раён) не вядуць ніякай працы па падрыхтоўцы да 10-цігадовага юбілею „Чырвонай Зьмены". Распаўсюджваньнем „Ч. З.". сярод моладзі ніхто не займаецца. Комсамольцы не чытаюць „Ч. З.".

Зараз-жа неабходна разгарнуць шырокую масавую працу па прасоўваньню Ч. З. у маладзёжныя масы, і да яе юбілею рэалізаваць пастанову ЦК ЛКСМБ аб давядзеньні тыражу „Ч. З." да 60 тысяч.

Дзеткор Дзераза

Фармат „Ч. З." неабходна павялічыць

„Чырвоная Зьмена" заўсёды была і ёсьць баявою газэтай ЛКСМБ. Закранутыя газэтай пытаньні заўсёды былі баявымі і дапамагалі ў працы комсамольскіх ячэек.

„Чырвоная Зьмена" выхавала з мяне юнкора-ўдарніка.

Аднак, разам з усімі дасягненьнямі, „Ч. З." мае яшчэ рад недахопаў. Бываюць выпадкі, калі мерапрыемства, паднятае газэтай, не даводзіцца да канца. Рэдакцыя невыстарчальна кіруе юнкор-рухам. Міжнародны аддзел невялікі. Фармат „Чырвонай Зьмены" зусім малы, да юбілею яго неабходна павялічыць.

Да 10-цігодзьдзя газэты мною організавана брыгада „ЧЗ" і я бяру на сябе абавязак організаваць яшчэ дальве.

Г. Кугель.

Друкарня ім» тав. Сталіна

Адказны рэдактар МІХ. ПЛАТАЎ.

Галоўлітбел № 599